# У АПОШНІ ВАГОН

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На лавачках, як заўсёды, сядзяць і хвалююцца бацькі абітурыентаў. Мама Вольга прыехала падтрымаць сына, які цяпер піша ЦТ па рускай мове.

— Мінулым разам Мікіта не змог да канца тэсты парашаць. Перахваляваўся, страціў прытомнасць у аўдыторыі. Нам дазволілі перездаць сёння.

Гэтым разам, упэўнена мама, усё атрымаецца. Усё ж такі за плячыма ўжо тэсціраванні па фізіцы і матэматыцы. З імі Мікіта справіўся даволі паспяхова. Калі руская мова не падвядзе, будзе спрабаваць прайсці на праграмаванне ў сябе, у Віцебску.

Усяго на рэзервовы дзень запісаліся 797 абітурыентаў. Здаць ЦТ можна было па ўсіх 15 прадметах. Рашаць тэсты ўчора дапусцілі толькі тых, хто быў папярэдне зарэгістраваны, але з аб'ектыўных прычын (дакументальна пацверджаных) не змог прыйсці ў асноўны дзень.

— Да ўважлівай прычыны адносіцца хвароба, удзел у міжнародных спаборніцтвах, — прыводзіць прыклад **член рабочай групы Дзяржкамісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах Леанарда МАЛЕЦ.** — Паколькі ўступныя выпрабаванні здаюць не толькі выпускнікі школ і гімназій, але і людзі, якія працуюць, іх адсутнасць можа быць абумоўлена вытворчай неабходнасцю: чалавек знаходзіцца ў камандзіроўцы. Ёсць і чыста тэхнічныя прычыны, напрыклад затрымаўся рэйс самалёта.

А вось абітурыентаў, якія не трапілі на іспыты ў асноўны дзень, бо не мелі з сабой пашпарта (захапілі, напрыклад, толькі яго копію ці пасведчанне кіроўцы), на перездачу не пусцілі.

— У пастанове выразна прапісана, што толькі дакумент, які пацвярджае асобу, з'яўляецца падставай для пропуску ў аўдыторыю. Тое, што пашпарт быў на візе, таксама не лічыцца ўважлівай прычынай. Тэрміны правядзення ўступнай кампаніі вядомы даўно, таму трэба вызначацца загадзя, што важнейшае: паехаць адпачываць ці атрымліваць вышэйшую адукацыю. Выключэнняў не бывае, — катэгарычна сцвярджае Леанарда Малец.

Паглядзець, як праходзіць рэзервовы дзень тэсціравання, прыехала **старшыня Дзяржкамісіі, намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.** «Хочам убачыць, ці папярэджваюць хлопцаў і дзяўчат чарговы раз, што нельга мець пры сабе ні шпаргалак, ні мабільных тэлефонаў», — заўважыла яна. Нагадаем, што сёлета за такія парушэнні з аўдыторый выдалілі 14 чалавек.

Віцэ-прэм'ер таксама паведаміла, што падчас правядзення тэсціравання ў рабочую групу дзяржкамісіі паступіў 21 зварот (5 пісьмовых і 16 вусных). У асноўным людзі хацелі пракансультавацца наконт рэгістрацыі на рэзервовы дзень. Калі задаволіць просьбу заяўнікаў было немагчыма, Дзяржкамісія падбірала альтэрнатыўныя варыянты для паступлення абітурыентаў у гэтым годзе. Напрыклад, прапаноўвала падаць дакументы ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, дзе набор адбываецца па конкурсе сярэдняга бала атэстата.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

# МІЛЬЁН КВЕТАК ДА ФЭСТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па традыцыі да пачатку «базару» здаюць «пад ключ» новыя аб'екты або завяршаюць рамонт. Сёлета такім падарункам гараджанам стануць адрамантаваны падземны пераход, прыведзеныя ў парадак двары і тратуары. Што важна — не толькі ў цэнтры. Завяршаюцца работы па мадэрнізацыі нумароў у гатэлях.

На нядаўнім пасяджэнні аргкамітэта фестывалю **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Наталля КАЧАНАВА** канстатавала, што гэты культурны праект стаў брэндам, які прываблівае ўсё больш удзельнікаў.

На 25-м Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2016» Беларусь прадставіць 26-гадовы Аляксей Грос. Хлопец нарадзіўся ў Салігорску, выступаў у джазавым аркестры. У 2012 годзе выйшаў у фінал адборачнага тура Міжнароднага конкурсу папулярнай музыкі «Новая хваля». Аж тры разы — фіналіст нацыянальнага адборачнага тура конкурсу «Еўрабачанне». Цікава, што ён кандыдат у майстры спорту па вольнай барацьбе.

Гран-пры гэтага конкурсу — 20 тысяч долараў. Старшыня журы — народны артыст Расіі Валерый Лявонцьеў.

А 10-гадовая мінчанка Насця Жабко — беларуская ўдзельніца XIV Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу. Выступае з пяці гадоў. У сем яе педагогам стаў Пётр Ялфімаў. Маленькая «зорка» — пераможца і лаўрэатка конкурсаў і фестываляў. Яна піша для газеты «Зорька». Захапляецца танцамі і тэатрам, добра малюе.

Гран-пры дзіцячага конкурсу — 5 тысяч долараў. Журы ўзначальвае Віктар Бабарыкін, заслужаны артыст, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.

Дарэчы, дзіцячай «алімпіядзе талентаў» на «базары» — 20 гадоў. У 1996-м прайшоў першы Міжнародны конкурс дзіцячых шоу-праграм. І толькі з 2003 года праходзіць цяперашняе спаборніцтва юных выканаўцаў...

У тым, што 25-ы «базар» пройдзе на самым высокім узроўні, сумненняў няма. Адзінае, што складана дакладна спрагназаваць, — якім будзе надвор'е. Яно цяпер «як артыстка, якая выступае ва ўсіх ролях». На сёння прагноз — слабыя дажджы ў дні неафіцыйнага і афіцыйнага стартаў фестывалю. А, як вядома, нешта пачынаць у дождж — на ўдачу. Прынамсі, у Віцебску на «базары» — гэта добрая прыкмета. Спякота, лівені не сапсуюць добры настрой тым, хто выступіць, убачыць канцэрты, ды і проста пажадае прайсціся па фестывальных вуліцах...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# «СВЯТОЧНЫЯ» НЕМАЎЛЯТКІ

## «Белая Русь» — з любоўю да дзяцей»

**Традыцыйная акцыя «Белая Русь» — з любоўю да дзяцей» праходзіць па ўсёй Беларусі. Дэпутаты, кіраўнікі адміністрацый раёнаў, прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Белая Русь» віншуюць жанчын, якія ў Дзень Незалежнасці сталі матулямі. З 2009 года за нараджэнне новых грамадзян такім чынам падзякавалі ўжо 2300 прадстаўніцам прыгожай паловы чалавецтва.**



Фота Надзеі БУЖАН.

52 дзіцяці нарадзіліся ў Мінску ў Дзень Незалежнасці Беларусі. Два хлопчыкі і дзве дзяўчынкі з'явіліся на свет 3 ліпеня ў 6-й клінічнай бальніцы Мінска, якую наведала **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** Яна адзначыла, што ў Беларусі шмат зроблена для таго, каб быць 25-й у ліку краін, прызнаных камфортнымі для матуль і дзяцей, і першай — сярод краін СНД. Дзякуючы сацыяльна арыентаванай палітыцы дзяржавы кожнае немаўля ў краіне нараджаецца жаданым, дадала міністр.

Ажно 15 немаўлят папоўнілі спіс нашых грамадзян у РНПЦ «Маці і дзіця». З віншаваннямі сюды завіталі прадстаўнікі «Белай Русі» і Мінскага Савета дэпутатаў.

— Сімвалічна, што цуд нараджэння адбываецца ў Дзень Незалежнасці Беларусі — галоўны дзень дзяржаўнасці нашай краіны, таму ваша асабістае свята мае дзяржаўны прысмак, — адзначыў, віншуючы мам, **Васіль ПАНАСЮК, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.** — Хочацца, каб праз 18 гадоў вашымі дзецьмі ганарыліся не толькі вы як бацькі, але і ўся сталіца і нават краіна. Каб мы з вамі змаглі сустрэцца яшчэ не адзін раз. Напрыклад, калі будзем уручаць вашым дзецям ганаровую грамату Мінгарвыканкама і Савета дэпутатаў або прысуджаць статус ганаровага грамадзяніна сталіцы.

Ён дадаў, што дзяржава не застаецца ўбаку ад клопатаў сям'і, і напярэдадні 3 ліпеня ў мікрараёне Каменная Горка адкрылася шматпрофільная дзіцячая паліклініка №4. У планах — дабудаваць установы аховы здароўя ў мікрараёнах Дружба-1 і Усходні.

**Намеснік кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна сталіцы Эдуард ТАМІЛЬЧЫК** выказаў спадзяванне, што дзеткі не толькі самі вырастуць здаровымі і прыгожымі, а і скіруюць свае думкі на тое, каб зрабіць нашу краіну такой жа.

Адна з маці, якія атрымалі віншаванні і падарункі ад аб'яднання, Вольга Змушко, нарадзіла 3 ліпеня сына Леаніда, а дома іх чакаюць яшчэ Каця і Міша. Жанчына шчыра падзякавала персаналу цэнтра за чалавечае стаўленне і добрасумленныя адносіны да працы.

**Ірына СІДАРОК.**

# УСЁ АБ АЛЬТЭРНАТЫЎНАЙ СЛУЖБЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прызыўная камісія таксама мае права папрасіць характарыстыку з месца працы (вучобы), а таксама іншую інфармацыю, якая мае адносіны да пытання і на пасяджэнні абавязана праінфармаваць аб гэтых дакументах і інфармацыі.

Што датычыцца прычын адмовы ў замене вайсковай службы на альтэрнатыўную, то яны вызначаны арт. 17 Закона «Аб альтэрнатыўнай службе». У прыватнасці, гэта адсутнасць прадугледжаных законам падстаў для накіравання на альтэрнатыўную службу, няяўка грамадзяніна без важных прычын на пасяджэнне прызыўной камісіі, выяўленне камісіяй недакладнасці звестак, якія маюць істотнае значэнне для прыняцця рашэння.

**— Калі ў працэсе альтэрнатыўнай службы чалавек перадумаў і хоча пайсці на тэрміновую службу, ці ёсць у яго такая магчымасць? І як у такім выпадку будуць пералічвацца дні службы?**

— Законам прадастаўлена права да дня пераезду да месца праходжання альтэрнатыўнай службы заявіць пра сваё жаданне прайсці ваенную службу. Такія грамадзяне прызываюцца на тэрміновую ваенную службу на агульных падставах і не могуць быць паўторна накіраваны для праходжання альтэрнатыўнай службы. У перыяд праходжання альтэрнатыўнай службы перавод на тэрміновую службу законам не прадугледжаны.

**— Законам вызначаны тэрміны альтэрнатыўнай службы для тых, хто не мае вышэйшай адукацыі, — 36 месяцаў, тым, хто мае вышэйшую адукацыю, — 24 месяцы. А якія перыяды не будуць залічвацца ў тэрмін службы? Як наконт бальнічнага, водпуску і г.д.?**

— У адпаведнасці з арт. 19 закона не залічваюцца дні адпачынку ў сувязі з паступленнем ва ўстанову адукацыі або арганізацыю паслявузаўскай адукацыі і атрыманнем адукацыі. Не залічваюцца і перыяды, якія прыпадаюць на тэрмін адбыцця пакарання ў выглядзе арышту, а таксама час, на працягу якога грамадзянін не выконваў абавязкаў альтэрнатыўнай службы ў сувязі з ужываннем да яго адміністрацыйнага спагнання.

Дні, на працягу якіх альтэрнатыўшчык адсутнічаў без уважлівых прычын больш за 3 гадзіны падчас выканання абавязкаў альтэрнатыўнай службы альбо знаходзіўся ў гэты перыяд часу ў стане алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення або распіваў спіртныя напоі, спажываў наркатычныя сродкі, псіхатропныя рэчывы, таксама не ўваходзяць у тэрмін альтэрнатыўнай службы.

А вось водпуск па хваробе, водпуск па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару залічваюцца ў тэрмін альтэрнатыўнай службы.

**— Ці распаўсюджваецца на альтэрнатыўшчыкаў вызваленне ад службы, калі яны — шматдзетныя бацькі?**

— Законам прадугледжана адтэрміноўка ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве па сямейным становішчы, у тым ліку калі маецца двое дзяцей. Адпаведна, гэтыя грамадзяне не накіроўваюцца на альтэрнатыўную службу.

## Час праходжання альтэрнатыўнай службы залічваецца ў працоўны стаж

**— Якія гарантыі для альтэрнатыўшчыкаў, у прыватнасці па жыллі, захаванні папярэдняга працоўнага месца і г.д.?**

— Грамадзяне, якія праходзяць альтэрнатыўную службу, вызваляюцца ад платы за карыстанне прадастаўленым ім на перыяд праходжання альтэрнатыўнай службы памяшканнем і за жыллёва-камунальныя паслугі. Пры гэтым за грамадзянамі, якія праходзяць альтэрнатыўную службу, захоўваецца права знаходзіцца на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў па месцы жыхарства і месцы працы (службы) на працягу ўсяго часу праходжання альтэрнатыўнай службы і аднаго года пасля яе заканчэння.

Акрамя гэтага, альтэрнатыўшчыкі маюць права на бясплатнае забеспячэнне лекавымі сродкамі, якія выдаюцца па рэцэптах урачоў у межах пераліку асноўных лекавых сродкаў.

Пасля звальнення з альтэрнатыўнай службы гарантуецца працяг навучання на ранейшых умовах ва ўстановах адукацыі, у якіх яны навучаліся да накіравання на альтэрнатыўную службу, а таксама прадастаўленне першага працоўнага месца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

За грамадзянамі, якія працавалі да накіравання на альтэрнатыўную службу ў дзяржаўных арганізацыях, захоўваецца права паступлення на працу да таго ж наймальніка на пасаду, раўназначную займанай да накіравання на альтэрнатыўную службу, на працягу трох месяцаў з дня, наступнага за днём звальнення з альтэрнатыўнай службы, а ў выпадку захворвання ў перыяд праходжання альтэрнатыўнай службы — на працягу трох месяцаў з дня аднаўлення працаздольнасці або ўстанаўлення інваліднасці.

Грамадзянам, прынятым на ранейшае месца працы, законам прадугледжана прадастаўленне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі ў памеры не менш як адной мінімальнай заработнай платы.

Час праходжання грамадзянамі альтэрнатыўнай службы залічваецца ў стаж працы.

**— Ці можа альтэрнатыўшчык навучацца завочна або на вячэрнім аддзяленні?**

— Так, можна атрымліваць адукацыю ў завочнай форме і ў форме саіскальніцтва.

**— Ці прадугледжваюцца нейкія прэферэнцыі па прадастаўленні першага працоўнага месца грамадзянам, звольненым з альтэрнатыўнай службы?**

— Згодна з арт. 35 Закона аб альтэрнатыўнай службе і новай рэдакцыі арт. 281 Працоўнага кодэкса, грамадзянам, звольненым з альтэрнатыўнай службы, гарантуецца прадастаўленне першага працоўнага месца.

**— Цікава, што будзе лічыцца дэзерцірствам — прагулы? І якія санкцыі за гэта прадугледжаны?**

— Ухіленнем ад праходжання альтэрнатыўнай службы з'яўляецца няяўка без важных прычын да месца праходжання альтэрнатыўнай службы, у тым ліку пры пераводзе ў іншую арганізацыю або прыбыцці з адпачынку, на тэрмін звыш трох сутак, але не больш за месяц, альбо ўхіленне ад праходжання альтэрнатыўнай службы на той жа тэрмін шляхам падробкі дакументаў або іншага падману. За гэта прадугледжана пакаранне ў выглядзе арышту.

Калі перыяд здзяйснення такіх парушэнняў перавысіў месяц, то прадугледжваецца адказнасць у выглядзе абмежавання волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## Гарадская гаспадарка

# ЗА ЦЁПЛЕНЬКІЯ ПЛАЦІЦЬ НЕ ТРЭБА

### Савет Міністраў удакладніў парадак пераразліку за няякасныя жыллёва-камунальныя паслугі

**Згодна з адпаведнай пастановай ад 30 чэрвеня, калі асноўныя камунальныя паслугі аказаны з недахопамі ці зусім не былі аказаны спажыўцу, пераразлік ажыццяўляецца з дня паступлення вуснага ці пісьмовага звароту апошняга да выканаўцы. Пералік асноўных жыллёва-камунальных паслуг дапоўнены паслугамі па санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў жылога дома, тэхнічным абслугоўванні ліфта, абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі.**

Пераразлік за няякасныя паслугі па тэхнічным абслугоўванні і санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў жылога дома (вестыбюляў, калідораў, лесвічных маршаў і пляцовак, ліфтавых холаў і да т.п.) у дачыненні да групы спажыўцоў праводзіцца з дня паступлення вуснага ці пісьмовага звароту аднаго з іх.

Калі паслугі па водазабеспячэнні, водаадвядзенні (каналізацыі), газа-, электра-, цеплазабеспячэнні, тэхнічным абслугоўванні ліфта, абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі не былі аказаныя або іх выкананне мела перапынак больш за 24 гадзіны, пераразлік пры адсутнасці прыбораў уліку ажыццяўляецца на суму, якая роўная кошту аб'ёму паслуг, якая не была аказана. Аб'ём паслугі ў такім выпадку разлічваецца зыходзячы з нарматыву спажывання, колькасці спажыўцоў ці агульнай плошчы жылых памяшканняў, а таксама тэрміну адсутнасці камунальнай паслугі.

Пераразлік платы за абслугоўванне і ўтрыманне дапаможных памяшканняў робіцца зыходзячы з удзельнай вагі іх кошту ў складзе штомесячнай платы і тэрміну парушэння.

Пастановай Саўміна таксама зацверджаны пералік дадатковых жыллёва-камунальных паслуг: устаноўка і абслугоўванне дамафонаў, сістэм відэаназірання, арганізацыя работы і ўтрымання вахцёраў, арэнда і замена дыванавых пакрыццяў, добраўпарадкаванне і азеляненне прыдамавых тэрыторый.

Акрамя таго, гарантыя на работы, якія былі выкананы падчас капітальнага рамонту, павялічваецца з двух да пяці гадоў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Геапалітыка

# ЛЕПШ — МІР



Галоўнай падзеяй апошніх дзён, несумненна, можна назваць распачатае **прымірэнне Расіі і Турцыі**. 27 чэрвеня Уладзімір Пуцін атрымаў пісьмо ад Прэзідэнта Турцыі Рэджэпа Эрдагана, змест якога дазволіў яму зрабіць крок у адказ — патэлефанаваць турэцкаму кіраўніку. 1 ліпеня ў рамках пасяджэння кіраўнікоў МЗС краін — удзельніц Арганізацыі Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва прайшла сустрэча міністраў замежных спраў Расіі і Турцыі. Меўлют Чавушаглу па выніках перамоў паведаміў, што яны «прайшлі ў сяброўскай і цёплай атмасферы. Турэцкі лідар Рэджэп Таіп Эрдаган гатовы сустрэцца ў Расіі з прэзідэнтам Уладзімірам Пуціным яшчэ да саміту G20, які пройдзе ў Кітаі». Гэту падзею, безумоўна, можна назваць пазітыўнай і для Расіі, і для Турцыі. Расійскі рынак шмат значыў для турэцкіх экспарцёраў, паколькі ў Турцыі, як і ў Беларусі, прыкладаюць вялікія намаганні для развіцця экспарту. Яго амаль поўная страта пасля ўвядзення расійскіх санкцый нанесла вялікі ўдар па гэтых планах. Што ўжо казаць пра значэнне расійскіх турыстаў для турыстычнай галіны Турцыі, якая і так моцна пакутуе ад частых тэрактаў, што адпалохвае ахвотных адпачыць на тэрыторыі краіны. 28 чэрвеня, дарэчы, адбыўся яшчэ адзін у стамбульскім аэрапорце. Тры тэрарысты-смяротнікі забілі 43 чалавекі. Для Расіі эканамічная і палітычная напружанасць у дачыненнях з Турцыяй таксама не карысная. І так хапае праблем з заходнімі санкцыямі, а праблемы з турэцкімі інвестыцыямі аказвалі дадатковы негатыўны ўплыў. Апроч таго, давялося адмовіцца ад плана дастаўкі газу ў ЕС па тэрыторыі Турцыі замест украінскага напрамку, што пры паляпшэнні адносін зноў можна будзе абмяркоўваць. Вельмі выгаднае развіццё падзей і для Беларусі, якой дрэнныя адносіны паміж Расіяй і Турцыяй, двума сваімі важнымі саюзнікамі, стваралі пэўны дыскамфорт.

На мінулым тыдні **працягвалі развівацца падзеі і з нагоды Brexit**. Паніка прайшла, пачалося асэнсаванне магчымых варыянтаў развіцця падзей. Усё яшчэ захоўваецца магчымасць далейшай дэстабілізацыі ЕС. У якасці прыкладу можна прывесці зробленую 1 ліпеня заяву прэзідэнта Чэхіі аб неабходнасці правядзення аналагічнага рэферэндуму ў краіне па выхадзе з ЕС і НАТА, арганізаваны збор подпісаў за правядзенне падобных да брытанскага рэферэндумаў у Фінляндыі і Славакіі. У той жа час лідары ЕС, Германія і Францыя, поўныя рашучасці зрабіць усё, каб выхад Вялікабрытаніі з Еўрасаюза быў максімальна некамфортным для краіны, тым самым даўшы паказальны ўрок іншым патэнцыяльным ахвотнікам выйсці. Шкода, нанесеная прэстыжу Еўрасаюза вынікамі брытанскага рэферэндуму, такая вялікая, што іх абурэнне можна зразумець. У якасці некаторага пазітыву можна дадаць, што негатыўны ўрон для кошту нафты, нанесены вынікамі рэферэндуму ў Вялікабрытаніі, быў рынкамі пераадолены. Крыху адыграў да канца тыдня пазіцыі і еўра, хоць ён усё яшчэ на два працэнтныя пункты ніжэй за долар, чым да абвяшчэння вынікаў.

30 чэрвеня Радрыга Дутэртэ прыняў прысягу ў якасці **новага прэзідэнта Філіпін**. Гэта краіна з'яўляецца важным гульцом у Паўднёва-Усходняй Азіі і перспектыўным рынкам збыту беларускай прадукцыі, улічваючы памер насельніцтва ў больш чым сто мільёнаў жыхароў. Стаць прэзідэнтам новаму кіраўніку дапамагла рэпутацыя непрымірымага змагара з наркагандлем і арганізаванай злачыннасцю.

1 ліпеня Кітай адзначаў **95-годдзе з дня стварэння Камуністычнай партыі Кітая**. Яна сапраўды шмат зрабіла для павышэння ўзроўню жыцця кітайскага насельніцтва, забяспечыўшы фенаменальны рост эканомікі ў апошнія чатыры дзесяцігоддзі. Выступаючы з прамовай, кіраўнік КНР Сі Цзіньпін назваў карупцыю галоўнай пагрозай для Камуністычнай партыі Кітая. Пры гэтым трэба адзначыць, што пасля яго прыходу да ўлады барацьба з карупцыяй набыла вельмі сур'ёзныя маштабы. У турмы ўжо трапілі дзясяткі тысяч карупцыянераў. Няма ніякай увагі да рангаў і пасад, за карупцыйныя злачынствы прыцягваюцца да адказнасці чыноўнікі любога ўзроўню. Зробленыя захады дазваляюць спадзявацца, што Кітаю ўдасца справіцца з карупцыйнай пагрозай, паколькі дэстабілізацыя краіны можа нанесці сусветнай эканоміцы вялікія страты.

На мінулым тыдні **кіраўнік Беларусі правёў дзве важныя сустрэчы** з высокапастаўленымі замежнымі чыноўнікамі. 27 чэрвеня прайшла сустрэча са старшынёй Нацыянальнага заканадаўчага сходу Тайланда Панпечам Вічытчалчаем. Асноўная ўвага на сустрэчы была ўдзелена развіццю тавараабароту, з прыцэлам на развіццё экспартных магчымасцяў для беларускіх прадпрыемстваў на 70-мільённым па насельніцтве рынку. Былі выказаны і прапановы беларускага боку па стварэнні сумесных зборачных прадпрыемстваў на тэрыторыі Тайланда. 30 чэрвеня прайшла сустрэча з міністрам замежных спраў Чэхіі Любамірам Заараленкам. Прэзідэнт Беларусі асабліва адзначыў, што ніколі не лічыў «ні Чэхаславакію, ні Чэхію, ні Славакію чужымі для нас дзяржавамі». Таксама ён зрабіў акцэнт на паляпшэнні адносін Беларусі не толькі з Чэхіяй, але і з усім Еўрасаюзам.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**


# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «РАДИОВОЛНА»

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот №1** | | |
| **Предмет торгов, краткая характеристика, местонахождение** | Изолированное помещение с инв. № 400/D-89156 общей площадью 3461,1 кв.м находится в кирпичном капитальном строении 1983 г.п., расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002004442 по адресу: г. Гродно, ул. М. Горького, 89. Часть помещения сдается в аренду: S – 40,4 м² и 38,6 м² – по 14.03.2017 г.*; S – 54,1 м² и 19,9 м² – по 14.03.2019 г.*; S – 398,1 м² – по 28.02.2021 г.* ** – В случае отчуждения имущества на торгах арендаторы обязуются расторгнуть договор аренды и освободить помещения в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.* | | |
| **Начальная цена** | 1 102 244 рубля 55 копеек с учетом НДС | **Сумма задатка (5%)** | 55 112 рублей |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Радиоволна», г. Гродно, ул. М. Горького, 89, тел. 8(0152) 437272 | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 12 августа 2016 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | По 8 августа 2016 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8 | | |

**Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by, телефоны для справок: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11**

Уважаемые акционеры открытого акционерного общества

# «Дорожно-строительный трест №1, г. Витебск»

**18 июля 2016 года в 15.00**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров.**
**Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова,16, актовый зал. Собрание проводится в очной форме.**

**Повестка дня собрания:**
1. О выплате дивидендов за 1 полугодие 2016 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет), с 11 по 15 июля 2016 г. (время работы с 8.30 до 17.30), либо 18 июля 2016 года по месту проведения собрания, тел. 37 45 66.

Регистрация участников собрания с 14.15 до 14.45 по месту проведения собрания.

Реестр владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 07 июля 2016 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 300000398 *Наблюдательный совет.*

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот №1. Колонки акустические Dynacord MT 215 (2 шт.) Первоначальная стоимость – 328 000 рублей.** **Лот №2. Усилитель Dynacord S 1200 (2 шт.) Первоначальная стоимость – 12 020 800 рублей.** **Лот №3. Усилитель Luxomat SW-02 (1 шт.) Первоначальная стоимость – 1 456 000 рублей.** **Лот №4. Усилитель Palladium 2000 (1 шт.) Первоначальная стоимость – 6 436 800 рублей.** **Лот №5. Колонки акустические Linear LP 112 (3 шт.) Первоначальная стоимость – 2 868 000 рублей.** **Лот №6. Световые лазерные установки Teclumen (2 шт.) Первоначальная стоимость – 7 292 800 рублей.** **Лот №7. Лампы неонового цвета (10 шт.) Первоначальная стоимость – 5 096 000 рублей.** **Лот №8. Шар электрический световой (1 шт.) Первоначальная стоимость – 996 000 рублей.** **Лот №9. Стулья барные (12 шт.) Первоначальная стоимость – 2 822 400 рублей.** **Лот №10. Мойки керамические (8 шт.) Первоначальная стоимость – 1 324 800 рублей.** **Лот №11. Водонагреватель электрический (1 шт.) Первоначальная стоимость – 712 000 рублей.** **Лот №12. Фонари уличные (9 шт.) Первоначальная стоимость – 3 290 400 рублей.** **Лот №13. Кондиционер McQuay MLC025CR Acpoa (1 шт.) Первоначальная стоимость – 9 498 400 рублей.** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОДО «БелЮрцМагистраль», УНП 391120443 |
| **Местонахождение (адрес) мущества** | Оршанский район, д. Юрцево, ул. Магистральная, 1 |
| **Информация об обременениях** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 1 **08 августа 2016 года в 10.00** |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, 211030, г. Орша, ул. Островского, 36 Главный специалист – Маханькова Анастасия Александровна, тел.: 80216543202, 80336161412. Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, тел. 80216543213 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, **не позднее 11.00 05.08.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ
по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества
**Организатор аукционов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.**

**Продавец: Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 61-66-90.**

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 17,07 кв.м (в т.ч. 14,91; 2,16 кв.м), расположенных на 2 этаже капитального строения с инв. №240/С-29422 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Флерова, д. 6А (здание отделения почтовой связи - 9). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Целевое использование:** для размещения офиса, складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). **Нач. цена (до/после деноминации):** 580 400/58,04 бел. руб. **Размер задатка (до/после деноминации):** 58 000/5,80 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 12.08.2016 в 15.00 по адресу: г. Орша, ул. Ленина, 46, здание РУПС. **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 06.07.2016 с 8.30 по 11.08.2016 до 17.30

**Продавец: УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» (Оршанская дистанция гражданских сооружений), г. Орша, ул. Заслонова, 3, тел. (0216) 29-20-61.**

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года помещений общей площадью 77,18 кв.м, расположенных на 3 этаже капитального строения с инв. №240/С-31817 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Молокова, 13 (здание бывшего НОД-1). Целевое использование: для размещения офиса (размер ежемесячной арендной платы 19,3 базовой арендной величины); осуществления розничной торговли непродовольственными товарами, оказания услуг по ремонту и пошиву швейных, меховых и кожаных изделий (размер ежемесячной арендной платы 7,72 базовой арендной величины). **Нач. цена (до/после деноминации):** 2 624 100/262,41 бел. руб. **Задаток (до/после деноминации):** 262 400/26,24 бел. руб.

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года торгового киоска «Купава» ТК 300 площадью 4,72 кв.м по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Молокова (около спорткомплекса «Локомотив»). Размер ежемесячной арендной платы 0,47 базовой арендной величины. Целевое использование: для осуществления розничной торговли. **Нач.цена (до/после деноминации):** 160 500/16,05 бел. руб. **Задаток (до/после деноминации):** 16 000/1,60 бел. руб.

Лот №3. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет капитального строения с инв. №240/С-29487 общей площадью 937,2 кв.м по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Заслонова (здание групповой котельной) для размещения персонала, складских помещений (размер ежемесячной арендной платы 356,14 базовой арендной величины); для размещения СТО, осуществления деятельности по производству продукции, выполнению работ, оказанию услуг (размер ежемесячной арендной платы 281,16 базовой арендной величины). **Нач. цена (до/после деноминации):** 31 864 800/3186,48 бел. руб. **Задаток (до/после деноминации)**: 3 186 500/318,65 бел. руб.

Лот №4. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений, расположенных в капитальном строении с инв. № 235/С-8356 общей площадью 180,25 кв.м по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, Круглицкий с/с, ст. Вятно (здание железнодорожного вокзала) для размещения персонала, складских помещений (размер ежемесячной арендной платы 54,08 базовой арендной величины); для размещения: услуги сетей сотовой радиотелефонной связи, туристические услуги, оказание бытовых услуг, магазин розничной торговли продовольственными и непродовольственными товарами, размещение парикмахерской; услуги по ремонту, пошиву и вязанию трикотажных изделий, услуги по ремонту и пошиву швейных, меховых кожаных изделий, услуги по ремонту кожгалантереи и зонтов, организация услуг общественного питания (размер ежемесячной арендной платы 21,63 базовой арендной величины). **Нач. цена (до/после деноминации):** 6 128 500/612,85 бел. руб. **Задаток (до/после деноминации):** 612 900/61,29 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 08.08.2016 в 15.00 г. Орша, ул. Заслонова, 3, в актовом зале Оршанской дистанции гражданских сооружений. Срок внесения задатка и подачи документов: с 06.07.2016 с 8.30 по 05.08.2016 до 17.30

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08 2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае, если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. **Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566. Контактные тел: (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**